3. Відеогра [Електронний ресурс]. – URL: https://uk.wikipedia.org/ wiki/ Відеогра.

4. *Дронь, А.* 5 наиївідоміших комп'ютерних ігор за мотивами книг [Электронный ресурс]. – URL: https://vsiknygy.net.ua/neformat/44561/.

5. *Зоренко, А. В.* Реклама в комп'ютерних іграх як спосіб маркетингових комунікацій [Электронный ресурс]. – URL: http://dspace.nuft.edu.ua/ jspui/ bitstream/123456789/16694/1/Advertising in computer games.pdf.

6. *Крыловский, К.* Реклама в компьютерных играх [Электронный ресурс]. – URL:http://www.ideaura.com/psycholog/computer_games_advertising.php.

7. *Лещук, О.* Game in Ukraine: кращі українські ігри і розробники [Электронный ресурс]. – URL: https://styler.rbc.ua/ukr/dosug/game-in-ukraine-luchshie-ukrainskie-igry-1443510932.html.

8. *Савенко, І. В.* Використання інструментів мерчандайзингу в діяльності інтернет-магазинів / І. В. Савенко, Л. В. Капніус, Н. П. Скригун // Актуальні проблеми економіки. – Київ, 2013. – № 5 (143). – С. 125–131.

9. Скрытая реклама в видеоиграх [Электронный ресурс]. – URL: http://konspekts.ru/marketing/skrytaya-reklama-v-videoigrax/.

10. *Шевяхова, Н.* Комп'ютерні ігри як територія пропаганди [Електронний ресурс]. – URL: http://osvita.mediasapiens.ua/web/ online_media/ kompyuterni_igri_yak_teritoriya_propagandi/.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАКУМЕНТНЫЯ КАМУНІКАЦЫІ: НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ АСЭНСАВАННЯ І НАВУКОВАГА РАЗВІЦЦЯ

***Н. Ю. Вайцэховіч,***
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Пытанні, звязаныя з будучыняй інфармацыйных тэхналогій і сістэм камунікацыі, маюць прынцоповае значэнне для прагназавання дзейнасці ва ўсіх сацыяльных сферах. Інфармацыйна-дакументныя камунікацыі знаходзяцца пад значным уплывам тэхналогій, якія трансфармуюць асноўныя параметры сістэмы ў бок адкрытасці, лічбавізацыі, пашырэння магчымасцяў узаемадзеяння з карыстальнікам на аснове мультымадальных сродкаў, інтэлектуалізацыі інфармацыйных сэрвісаў і сістэм абарачэння ведаў. Многія з рэалізуемых тэхналогій знаходзяцца на чацвёртай («схіл асветы») і пятай («плата прадуктыў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці») стадыі цыклу тэхналагічнай сталасці па Gartner, а гэта значыць, будуць аказваць глыбокі ўплыў на трансфармацыю сістэмы інфармацыйна-дакументных камунікацый і надалей.

Тэхналагічныя змены ў значнай ступені стымулююць пераасэнсаванне тэарэтычных асноў функцыянавання інфармацыі ў грамадстве, механізмаў інфармацыйнага абмену, відаў, формаў і мадэляў камунікацыі ў інфармацыйна-дакументнай сферы. Ужо на працягу дзесяці гадоў ядро актыўных ведаў у гэтай галіне складаюць ідэі і падыходы, прынцыпова звязаныя з асэнсаваннем перадавых тэхналагічных практык і адпаведных сацыяльных змен. Дадзены артыкул не прэтэндуе на паўнавартасны разбор усяго комплексу тэарэтычных ведаў у сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый, аднак мае на мэце абмеркаванне некаторых агульнапрынятых канстант, якія дагэтуль у значнай ступені вызначаюць асноўныя ракурсы вывучэння праблем інфармацыі і дакументацыі.

Так, у інфармацыйна-дакументных навуках універсальна прынята антрапацэнтрычная (камунікатыўная) канцэпцыя разумення сутнасці інфармацыі. Згодна з ёй інфармацыя вызначаецца як звесткі, факты, канцэпты, веды, якія набываюць пэўную форму падачы ў працэсах інфармацыйнага абмену ў грамадстве. Найчасцей менавіта гэтая форма разглядаецца як інфармацыя, што ў лічбавую эпоху прыводзіць да фактычнага атаяснення паняццяў «інфармацыя» і «даныя» (падача інфармацыі ў фармалізаваным выглядзе, прыдатным для перадачы, апрацоўкі, выкарыстання).

Для спецыялістаў гуманітарнай сферы, у тым ліку інфармацыйна-дакументных навук, найважнейшым для разумення сутнасці інфармацыі аспектам з'яўляецца яе праяўленне ў камунікатыўных працэсах. Па-за межамі гэтых працэсаў (перадачы, распаўсюджання інфармацыі, інфармацыйнага абмену, інтэракцыі) інфармацыя фактычна не разглядаецца.

Тое, што інфармацыя мае значэнне, якое карэліруецца з нейкай сістэмай з вызначанымі фізічнымі і канцэптуальнымі характарыстыкамі, сцвярджаецца яшчэ ў матэматычнай тэорыі камунікацыі К. Шэнана. Свядомае ігнараванне сэнсавага аспекту, ірэлевантнага інжынернай праблеме перадачы інфармацыі па тэхнічных каналах сувязі, дазволіла Шэнану пабудаваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

строгую тэорыю інфармацыі, прыдатную для любых фізічных сістэм.

У гуманітарных навуках інфармацыя, наадварот, разглядаецца толькі ў семантычным аспекце (гэта значыць пад інфармацыяй разумеюць сэнс паведамлення, часцей за ўсё – як вынік інтэрпрэтацыі), а самой здольнасцю канструяваць сэнс надзяляюцца толькі людзі. Адсутнасць узгадненняў з фізіялагічнымі механізмамі ўспрыняцця і апрацоўкі інфармацыі біялагічных арганізмаў, прынамсі вышэйшых жывёл, а таксама з працэсамі кіравання інфармацыяй у інтэлектуальных сістэмах прыводзіць да ізаляванасці адпаведных тэорый і немагчымасці прымяняць іх да вырашэння найважнейшых міждысцыплінарных праблем: сэнсавая апрацоўка інфармацыі інтэлектуальнымі прыёмнікамі, двухбаковае чалавека-машыннае ўзаемадзеянне, развіццё нейракамп’ютарных інтэрфейсаў, інтэлектуальны аналіз даных і інш. Для інфармацыйна-дакументнага комплексу навук гэта азначае фактычнае выключэнне з распрацоўкі праблем аугментацыі чалавечых магчымасцяў на аснове ўзаемадзеяння з інтэрактыўнымі носьбітамі інфармацыі, складанымі камунікацыйнымі сістэмамі, сеткамі ведаў (knowledge network), інтэлектуалізаванай рабочай прасторай.

Прыкладное разуменне сутнасці інфармацыі толькі як даных або звестак, якія перадаюцца ў працэсе сацыяльнай камунікацыі, без падключэння функцыяналістычных, атрыбутыўных і іншых падыходаў і ракурсаў, істотна звужае традыцыйную для інфармацыйна-дакументных навук галіну вывучэння чытання, інфармацыйных патрэб карыстальнікаў, інфармацыйных паводзін, зменлівых стратэгій пошуку, апрацоўкі, ацэнкі і выкарыстання інфармацыі ва ўмовах сучаснага інфармацыйнага грамадства.

У выніку ў сферы вывучэння чытання склалася сітуацыя, калі культуралагічныя, тэхналагічныя, сацыяльныя, паводніцкія і нейралагічныя аспекты чытання не інтэграваны і амаль не ўзгоднены паміж сабой. Дадзеныя, атрыманыя ў выніку сацыялагічных даследаванняў чытання па традыцыйных для інфармацыйна-дакументных навук методыках, супярэчаць вынікам кагнітыўных і нейралагічных даследаванняў, якія самі па сабе даволі неадназначныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так, у сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый на падставе ўласных даследаванняў склалася агульнае меркаванне аб зніжэнні цікавасці да чытання, звужэнні тэматычнага і відавога дыяпазону, актыўнасці, сістэматычнасці і інш. Абсалютная большасць гэтых даследаванняў датычыць толькі аднаго віду чытання – паглыбленага сфакусаванага (лінейнага). Існуюць спробы сабраць дадзеныя наконт некаторых відаў анлайн-чытання, аднак методыка збору гэтых дадзеных абыходзіць найважнейшыя кагнітыўныя і фізіялагічныя параметры чытання і, адпаведна, не дазваляе рабіць аргументаваныя высновы. Да такіх крытэрыяў належаць, перш за ўсё, умовы і ступень чытацкай актывацыі, работа з кантэкстам, кагнітыўная накіраванасць, шматзадачнасць і складанасць чытання, мультымадальнасць (пераключэнне ўвагі з аднаго віду інфармацыі на іншы), узровень разумення тэксту (сэнсавая апрацоўка), узровень эмацыйнага падключэння і іншыя характарыстыкі, якія дазваляюць даследаваць чытанне як культурна абумоўлены кагнітыўна-складаны працэс. З усіх падобных параметраў звычайна выкарыстоўваюць хуткасць чытання і яго залежнасць ад носьбітаў інфармацыі, а таксама некаторыя «адукацыйныя» крытэрыі сэнсавай апрацоўкі.

Вынікі нейрафізіялагічных даследаванняў дэманструюць карціну змянення работы мозга і вышэйшых коркавых функцый пад уплывам чытання. Тэкставае сканаванне і скімінг, мультымадальнае пераключэнне робяць чытанне больш складаным і энергетычна затратным працэсам, павышаюць разумовую нагрузку і навучаюць мозг новым кагнітыўным задачам. З другога боку, чытанне лонгрыдаў, асабліва высакаякаснай мастацкай літаратуры са складанымі метафарамі і сінтаксісам, выклікае нашмат мацнейшы і працяглы водгук, задзейнічае большы аб'ём мозга, чым чытанне спрошчаных тэкставых версій [2]. Аналіз імклівых трансфармацый у характары ўспрыняцця і разумення інфармацыі, атрыманай з крыніц розных відаў, жанраў, знакавай і фармальнай прыроды, з апорай на комплекс міждысцыплінарных ведаў – гэта адзін з эфектыўных спосабаў вывучэння праблем сучаснага інфармацыйнага грамадства новымі сродкамі і адпаведным інструментарыем.

На фундаментальным узроўні інфармацыйна-дакументных навук гэта азначае пераасэнсаванне прыроды інфармацыі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўных механізмаў яе функцыянавання ў грамадстве. Перш за ўсё, адыход ад канцэпцыі нематэрыяльнасці і аб’ектыўнасці сэнсу, вывучэнне яго як асобаснага значэння, якое набывае інфармацыя ў канкрэтнай сітуацыі яе ўспрыняцця і разумення. Сэнс інфармацыі вызначаецца кантэкстам, а таксама сацыяльна-культурнымі ўстойлівымі і сітуацыйнымі матрыцамі, якія распазнаюцца псіхікай і ўздзейнічаюць пры генерыраванні сэнсу на падсвядомым (распазнаванне навізны і значнасці сігналаў) і свядомым (фарміраванне сэнсу для рэагавання) узроўнях. Канцэпцыя «вымання» сэнсу, як аб’ектыўна зададзенага ў паведамленні, падаецца даволі архаічнай і не адпаведнай сучаснаму ўзроўню развіцця навуковых ведаў.

Канцэпцыя інфармацыі як звестак [1] або ведаў (тым больш як формы перадачы ведаў у часе і прасторы) становіцца малапрадуктыўнай для інфармацыйна-дакументных навук, бо ў гэтым значэнні немагчыма апісаць большасць сучасных інфармацыйных працэсаў. Канцэпцыя інфармацыі як дадзеных, якія апрацоўваюцца і інтэрпрэтуюцца для атрымання сэнсу [3], больш прыдатная для вырашэння сённяшніх рабочых пытанняў у сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый. Аднак пры пашырэнні на міждысцыплінарныя галіны, якія знаходзяцца пад значным уплывам фізіка-матэматычных, кібернетычных, біялагічных, сінергетычных падыходаў, дадзенае вызначэнне не спрацоўвае.

З паняццем інфармацыі звязана развіццё многіх тэхнічных, прыродазнаўчых, гуманітарных навук і міждысцыплінарных галін ведаў, і дакладнае, вычарпальнае яе вызначэнне застаецца дагэтуль адной з самых складаных навуковых задач. Тым не менш найбольшую прадуктыўнасць у вырашэнні сучасных навуковых і практычных праблем паказваюць падыходы, якія грунтуюцца на вызначэнні інфармацыі як фундаментальнай колькаснай характарыстыкі сістэмы, непасрэдна звязанай з энергіяй; як меры ўпарадкаванасці і складанасці сістэмы; як меры змяншэння (або зняцця) нявызначанасці ў выніку атрымання сігнала.

Пры аналізе сістэмы інфармацыйна-дакументных камунікацый разглядаюцца асобныя інфармацыйныя і камунікацыйныя сістэмы, іх элементы, працэсы, а таксама функцыянаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дынамічнай сістэмы цалкам, што прыводзіць да неабходнасці адаптаваць асноўныя функцыяналістычныя падыходы разумення сутнасці інфармацыі і вывучэння інфармацыйных працэсаў і з'яў. Інфармацыя ў такіх падыходах разглядаецца як сігналы, якія апрацоўваюцца сістэмай для карэктыроўкі функцыянавання пры адаптаваным кіраванні і самакіраванні. Комплекс тэорый, якія закранаюць аспекты кіравання, сувязі і кантролю ў складаных кібернетычных сістэмах, функцыянал носьбітаў і пераўтваральнікаў інфармацыі, пабудовы эфектыўных формаў і сродкаў інфармацыйнага абмену, аб'ектывацыі, абарачэння і выкарыстання ведаў, маглі б істотна пашырыць і дапоўніць тэарэтычны базіс інфармацыйна-дакументных навук. Перш за ўсё гэта датычыць тэорыі інфармацыйных патрэб карыстальнікаў як базавай перадумовы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, на якой традыцыйна будуецца канцэпцыя інфармацыйнага сэрвісу, аналіз дзейнасці інфармацыйных устаноў і мэтавай накіраванасці інфармацыйна-дакументных камунікацый.

У сацыяльных асяродках інфармацыйныя працэсы і сістэмы маюць выразныя асаблівасці, таму неабходна пазбягаць механічнага пераносу фізіка-матэматычных падыходаў на аналіз культурных і сацыяльных з'яў. У гуманітарных навуках актыўна развіваюцца арыгінальныя падыходы і цэлыя комплексы навуковых ідэй, сканцэнтраваныя на праблемах нелінейнай культурнасці, новых відаў, формаў і мадэляў камунікацыі ў медыйна-інфармацыйнай прасторы, а таксама комплексным разборы інфармацыйнага грамадства як культурнага і сацыяльнага праекта. Тым не менш у комплексе інфармацыйна-дакументных навук пакуль не перагледжана базавая канцэпцыя сацыяльнай камунікацыі як працэсу перадачы інфармацыі ці інфармацыйнага абмену (адпаведна дакументнай камунікацыі – як інфармацыйнага абмену, апасродкаванага дакументамі) з захаваннем лінейных мадэляў яе ажыццяўлення.

Любы рэальны камунікацыйны працэс у сацыяльнай сферы ўключае акрамя трансляцыйнага (перадача інфармацыі) выразны інтэракцыйны аспект (узаемадзеянне ў сацыяльна-культурных умовах канкрэтнай сітуацыі). Для камунікатыўных працэсаў у інфармацыйна-дакументнай сферы нароўні з лінейнымі характэрны сеткавыя і нелінейныя мадэлі, якія адлюстроў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваюць інфармацыйную дзейнасць ва ўмовах сеткавай самаарганізацыі і культуралагічныя аспекты ўзаемадзеяння з тэкстам.

Такім чынам, дапаўненне і ўзбагачэнне класічных тэорый новымі падыходамі, міждысцыплінарнымі ракурсамі вывучэння праблем інфармацыі і дакументнай камунікацыі дазваляць ахапіць цэлы шэраг аспектаў інфармацыйнага абмену, тэхналагічных мадэляў распаўсюджання ведаў і ўзаемадзеяння людзей і сістэм у сучасным інфармацыйным грамадстве.


*1.* Сістэма стандартаў па інфармацыі, бібліятэчнай і выдавецкай справе. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія. Тэрміны і азначэнні: СТБ ГОСТ 7.0-2004. – Мінск : Дзяржстандарт : Белорус. гос. ин-т стандартизации и сертификации, [2004]. – 35 с.

*2. Cull, B. W.* Reading revolutions: Online digital text and implications for reading in academe [Electronic resource] / Barry W. Cull // First Monday, 2011. – V. 16, № 6. – Access mode : https://doi.org/10.5210/fm.v16i6.3340.

*3.* ISO 5127-2017 Information and documentation. Foundation and vocabulary [Electronic resource]. – Access mode : https://www.iso.org/obp/ui/#iso:std:iso:5127:ed-2:v1:en.


## ТВОРЧЕСКИЕ КОЛЛЕКТИВЫ И ИЗВЕСТНЫЕ ВЫПУСКНИКИ КАФЕДРЫ БЕЛОРУССКОГО НАРОДНО-ПЕСЕННОГО ТВОРЧЕСТВА УЧРЕЖДЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ «БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ»


***А. Ю. Володченко,***

*старший преподаватель кафедры белорусского народно-песенного творчества Белорусского государственного университета культуры и искусств*


Национальное народно-песенное исполнительство благодаря разнообразию форм и жанров хорового и ансамблевого пения вызывает неподдельный интерес у современных слушателей. Это выражается не только аншлагами в концертных залах, где работают профессиональные певцы-народники, но и активным ростом численности любительских коллективов, популяризирующих сегодня аутентичный и сценический фольклор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ